# У жанры імправізацыі

**...педагогаў яслаў-сада № 3 Зэльвы накіравана на выяўленне рознабаковых здольнасцей дзяцей і стварэнне ўмоў для рэалізацыі іх творчага патэнцыялу. Нашы выхаванцы паказваюць яркія здольнасці ў песенным і танцавальным выкананні, музычна-тэатралізаванай і гульнявой дзейнасці. Дзеці чула рэагуюць на характар і настрой музыкі, добра спяваюць і іграюць на музычных інструментах. У песню або танец яны ўкладваюць многа энергіі і пачуццяў, імкнуцца выказаць свой настрой, ствараюць свае, арыгінальныя мелодыі.**



Асноўныя веды і ўменні дзеці атрымліваюць у гульнявой дзейнасці. Нашы педагогі выкарыстоўваюць сістэму навучання, у цэнтры якой знаходзіцца музычна-гульнявы вобраз, з дапамогай якога дзіця спасцігае свет музыкі, развівае вобразнае мысленне і ўяўленне. Такі падыход дае магчымасць выкарыстоўваць у працэсе музычнага выхавання разнастайныя метады і гульнявыя

Музычна-прадметнае асяроддзе носіць развіццёвы характар. Дзеці дзейнічаюць са знаёмымі і малазнаёмымі прадметамі, разважаюць, думаюць, параўноўваюць, мадэлююць і вырашаюць праблемныя сітуацыі. У дзіцячым садзе ар-

на-дыдактычныя гульні, музычныя інструменты. Сабрана фанатэка "Сам-насам з прыродай", "Галасы жывёл і птушак", "Класічная музыка".

Ва ўсіх відах дзейнасці выкарыстоўваецца гукавы дызайн. Ён стварае ўтульнасць і разам з тым нясе пазнавальную і эстэтычную нагрузку. Песенна-гульнявая творчасць садзейнічае праяўленню самастойнасці і творчаму працэсу: дзеці вучацца імправізаваць песні рознага характару, мелодыю на зададзеныя вершы, на ўласны тэкст, ствараць мелодыі рознага характару. Выхаванцы развіваюць свае творчыя здольнасці праз рух, пластыку, міміку і жэсты.

Тэатралізаваныя заняткі з дзецьмі праводзяцца ў форме гульні-імправізацыі. Выхаванцы адпраўляюцца ў казачнае падарожжа ў чароўную краіну Тэатралію, даведваюцца, што такое тэатр і які ён бывае, хто такія акцёр, актрыса, хто стварае спектакль, знаёмяцца з тэатральнай азбукай.

Станаўленне творчай асобы дзіцяці асабліва эфектыўна ад-...



пастаноўка праблемы або стварэнне праблемнай сітуацыі, стварэнне крэатыўнага поля, пераход гульні на іншы, больш складаны ўзровень, практыкаванні, эцюды.

Дзеці разам вар'іруюць сюжэты літаратурных твораў, ствараюць свае казкі і інсцэніруюць іх. Такія творчыя заданні называем хвілінкамі фантазіі.

Паглыбляючы дзіця ў творчы працэс, імкнёмся развіць яго фантазію, цікавасць да падрыхтоўкі і правядзення спектакля. Тэатральныя імправізацыі таксама спрыяюць эмацыянальнаму выхаванню дзяцей, развіваюць уменне выліць энергію, перадаць сваё бачанне свету. Уважліва прадуманы сцэнарый, аб'яднанне канцэртных нумароў цікавым сюжэтам, выразнае выкананне дзецьмі песень, вершаў, танцаў, сцэнак, тэатральных пастановак, цеснае творчае супрацоўніцтва з іншымі педагогамі



дзіцячага сада — вось залог нашага поспеху.

На працягу навучальнага года мы пастаянна супрацоўнічаем з бацькамі, звяртаючы ўвагу мам і татаў на развіццё ...

...няе кафэ", "Зімовы вечар", "Вольная гадзіна").

Напрыканцы хацелася б правесці такую аналогію: кветка вырасце прыгожай пры наяўнасці трох галоўных умоў: святла, цяпла і вільгаці. Дзіця стане гарманічна развітой асобай, калі ўсе педагогі ўкладуць у яго выхаванне дабрыню, цеплыню, веды і часцінку сваёй душы.

Па выніках раённых фестываляў дзіцячай творчасці выхаванцы нашай дашкольнай установы перамагалі ў намінацыях "Найлепшы саліст-вакаліст" і "Найлепшы вядучы"; у конкурсе тэатральных калектываў "І гучала казка" займалі прызавыя месцы. Перайшоўшы на старшую ступень навучання, выпускнікі нашай установы дашкольнай адукацыі Наташа Капыловіч, Віка і Веранікa Грынцэвіч, Насця Патаповіч, Таццяна Пузач актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці школы: выступаюць на школьных вечарынах, святах, удзельнічаюць і з'яўляюцца прызёрамі раённых і абласных аглядаў — конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Нашы выпускнікі займаюцца ў школе мастацтваў: Кірыл Гогаль — па класе баяна, Настасся Патаповіч — па класе фартэпіяна, а таксама харэаграфіяй — ...

ПРЫЁМЫ МУЗЫЧНА...